# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 4 (33)




## У «Плацдарма» — Гран-пры

**На працягу ўсёй сваёй гісторыі найстарэйшая беларуская газета заўсёды ішла побач з абаронцамі Айчыны. Сімвалічна, што 23 лютага 2011 года ў межах сумеснага супрацоўніцтва рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны на старонках выдання пачаў друкавацца рэгулярны спецвыпуск «Плацдарм».**

**За непрацяглы час, які існуе ўкладка, яна не раз была адзначана на самым высокім узроўні. Літаральна на днях на галоўным конкурсе сярод друкаваных СМІ менавіта за спецвыпуск «Плацдарм» газета «Звязда» атрымала Гран-пры конкурсу «Залатая Ліцера». Галоўная ўзнагарода была прысуджана выданню ў намінацыі «Лепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў». А крыху раней, у лютым 2014 года, на штогадовым творчым конкурсе на лепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі, патрыятычнага выхавання насельніцтва праект рэдакцыі выдання і Міністэрства абароны «Плацдарм» быў прызнаны лепшым у намінацыі «Спецыяльны праект».**

**«Плацдарм» працягвае выходзіць на старонках «Звязды». Сёння чытачам прапануюцца іншыя публікацыі, але на тую ж тэму — ваенна-патрыятычную.**

■ Тонкасці прафесіі

# ВАРТАВЫЯ ПАВЕТРАНЫХ МЕЖАЎ

### Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў адным з падраздзяленняў Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны



Памочнік аператыўнага дзяжурнага лейтэнант Максім МОНІЧ праводзіць кантроль функцыянавання апарата.

**Штодзень на баявое дзяжурства па супрацьпаветранай абароне ва Узброеных Сілах Беларусі заступае больш за 500 ваеннаслужачых і асоб грамадзянскага персаналу. Асабовы склад дзяжурных змен кожны дзень суправаджае звыш 400 паветраных судоў. На шчасце, сённяшнім вайскоўцам не прыходзіцца страляць на паражэнне. Аднак яны кожную хвіліну трымаюць руку на пульсе.**

КАБ пабачыць усё на свае вочы, карэспандэнты «Звязды» накіраваліся ў Фаніпаль — у 15-ю зенітную ракетную брыгаду Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання. Разам са спецыялістамі Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны «заступілі» на баявое дзяжурства і даведаліся шмат чаго цікавага.

Працоўны дзень дзяжурнай змены пачынаецца ў 7.30 раніцы. Медыцынскі агляд, псіхалагічная гутарка — і ўрачыстае пастраенне на рытуальнай пляцоўцы з падняццем Дзяржаўнага сцяга і выкананнем гімна. Загад заступіць на абарону паветраных межаў рэспублікі — і спецыялісты накіроўваюцца на камандны пункт. На працягу гадзіны адбываецца кантроль усіх сістэм, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні, праверка дакументацыі. Ваеннаслужачым даводзяцца асаблівасці будучага дзяжурства. І толькі пасля гэтага новы разлік пачынае баявое дзяжурства.

Пасля на камандным пункце застаецца дзяжурная змена — мінімальная колькасць людзей, гатовых у любы момант уключыць тэхніку і падрыхтаваць яе да прыбыцця асноўнага разліку. Затым мяняюцца. І так на працягу сутак.

У кожнага з іх свае задачы. Памочнік аператыўнага дзяжурнага, у асноўным, працуе па спраўнасці, своечасовым уключэнні аўтаматызаваных сістэм упраўлення. Планшэтысты наносяць на спецыяльныя карты паветраную абстаноўку, якую ім дакладваюць з розных радыётэхнічных падраздзяленняў. Дзяжурны па сувязі, адпаведна, кантралюе спраўнасць каналаў сувязі. Аператыўны дзяжурны адказвае за ўсё. Сёння ім з'яўляецца маёр Андрэй Міхнёнак.

— Самая галоўная задача, на якую працуюць усе, — хуткае і дакладнае давядзенне сігналаў і камандаў міністра абароны, начальніка генеральнага штаба на прывядзенне вайсковай часці ў больш высокія ступені баявой гатоўнасці, — расказвае Андрэй Міхнёнак. — Тады ўключаюцца дывізіёны, якія сваімі сродкамі разведкі працуюць па выяўленні паветраных судоў.

Назіраць за паветранай прасторай не ўваходзіць у абавязкі зенітных ракетных войскаў. Пастаянна за паветранай прасторай сочаць радыётэхнічныя войскі. На шчасце, сучасныя радыёлакацыйныя станцыі «заўважаюць» усе цэлі на тэрыторыі краіны, якія рухаюцца ва ўсіх дыяпазонах вышынь і хуткасцяў.

Аднак, як той казаў, давярай, але правярай. Сучасная тэхніка хоць і надзейны сродак назірання за паветранай прасторай краіны, аднак падстрахавацца не перашкодзіць. Невыпадкова на кожным падраздзяленні дзяжураць назіральнікі ПВН, якія без усялякіх прыбораў візуальна могуць ацаніць абстаноўку. Як толькі ў паветры заўважаюць пэўны лятальны апарат, адразу паведамляюць аб гэтым на камандны пункт.

— Шум рухавіка вінтавога самалёта, — далажыў па гучнай сувязі назіральнік ПВН.

Маёр Міхнёнак прымае інфармацыю, аб чым паведамляе на камандны пункт Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання.

— Верталёт ідзе па заяўцы згодна з планавым пералётам, — адказваюць яму.

Супакоіліся. Калі не па заяўцы, у паветра ўздымаецца верталёт і прымушае аб'ект да пасадкі. У выпадку супраціўлення сюды паступае каманда — перайсці ў баявую гатоўнасць № 1, што азначае падрыхтавацца да адкрыцця агню.

— На шчасце, такіх выпадкаў у Беларусі не было, — расказвае **начальнік штаба, першы намеснік камандзіра брыгады палкоўнік Алег ВОЙЧАНКА.** — Напэўна, таму, што дзяжураць высокакваліфікаваныя спецыялісты. А на ўзбраенні — толькі сучасная тэхніка: зенітныя ракетныя сістэмы «С-300». Дзякуючы комплексным сістэмам аўтаматызацыі «Паляна-РБ», мы маем магчымасць бачыць усю абстаноўку з дывізіёнаў і кіраваць імі, а таксама атрымліваць інфармацыю ад радыётэхнічных войскаў, ад авіяцыі.

Дзень праходзіць так, што ні на хвіліну не адлучышся. А яшчэ няма падрыхтоўкі да параду! У перадсвяточныя дні на камандны пункт паступае да 380 дакладаў аб паветранай абстаноўцы.

Для Андрэя Міхнёнка гэта звычайныя працоўныя дні. Праўда, нагрузка большая. Толькі справіцца з ёй вопытнаму спецыялісту нескладана. У брыгадзе ён з 2003 года: на малую радзіму, у Фаніпаль, трапіў адразу пасля заканчэння Ваеннай акадэміі Беларусі. Выпускнік факультэта ракетных войскаў і артылерыі тут праходзіў службу на розных вайсковых пасадах: пачынаючы ад камандзіра ўзвода варты каманднага пункта брыгады да аператыўнага дзяжурнага. Атрымліваецца, што за гэты час засвоіў зусім іншую прафесію.

— Першапачаткова было складана: новыя тэрміны, паняцці, — прызнаецца маёр Міхнёнак. — Трэба было зразумець і ўсе тонкасці гэтай прафесіі: хутка рэагаваць на змяненне абстаноўкі, валодаць максімальнай сканцэнтраванасцю, адначасова ўмець рабіць некалькі спраў. Дапамагалі больш вопытныя калегі.

Сёння ўжо ў яго вучацца многія вайскоўцы. І днём і ноччу на камандным пункце нясуць баявое дзяжурства каля 20 чалавек: афіцэры, прапаршчыкі, кантрактнікі, вайскоўцы тэрміновай службы. Служаць тут і грамадзянскія спецыялісты. Спачатку яны, як і прадстаўнікі новага папаўнення, праходзяць навучанне. І толькі пасля паспяховай здачы іспытаў дапускаюцца да нясення баявога дзяжурства.

— Для таго, каб выконваць свае абавязкі, ваеннаслужачыя нашага падраздзялення ў першую чаргу павінны быць высокаадукаванымі, — удакладняе начальнік штаба. — Не малое значэнне мае і іх здароўе, маральна-псіхалагічны стан. Астатнія патрабаванні да супрацоўнікаў залежаць ад таго, якую пасаду яны будуць займаць. У нас вельмі шырокае кола спецыяльнасцяў, больш за 50. Калі сюды прыходзяць людзі, ажыццяўляецца размеркаванне ў залежнасці ад узроўню фізічнай падрыхтоўкі і інтэлектуальных асаблівасцяў.

Нясуць баявое дзяжурства ў зенітнай ракетнай брыгадзе і жанчыны. Гэтым ужо нікога не здзівіш. Толькі ўсё роўна цікава, што прываблівае іх у мужчынскай прафесіі? Асабліва, калі яны прыгожыя дзяўчаты, якім крыху больш за 20.

— Я з тых людзей, якія не могуць сядзець на адным месцы, — кажа Юлія Палітаева. — Пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа тую працу, якая б мяне задаволіла, знайсці было цяжка. Знаёмыя падказалі, што можна ўладкавацца ў брыгаду. Вырашыла паспрабаваць, аб чым ні разу не пашкадавала.

Нагрузка дзяўчыну не засмучае: аргументуе тым, што мае добрае здароўе. Галоўнае, як яна прызнаецца, у сям'і яе выбар падтрымліваюць. Вайскоўцам быў толькі дзядзька, неўзабаве ў армію пойдзе родны брат.

Пакуль размаўлялі, прыйшоў час ехаць на адзін з дывізіёнаў брыгады — туды, дзе ў любы час спецыялісты гатовы прывесці тэхніку ў гатоўнасць № 1. Тут працуюць сапраўдныя прафесіяналы! Кіраваць «С-300» у выпадковага вайскоўца наўрад ці атрымаецца. Таму тут выпадковых не бывае.

Начальнік разліку аддзялення баявога кіравання старшы лейтэнант Яўген Галузаў прызнаецца, што ўсе тыя веды, якія атрымаў у Ваеннай акадэміі, спатрэбіліся на практыцы. Сёння ў яго падпарадкаванні знаходзяцца 8 салдат тэрміновай службы. Адслужыўшы толькі два гады, паспеў прайсці атэстацыйную камісію: зараз чакае загаду на прызначэнне яго на пасаду начальніка аддзялення.

— Прафесія спецыяліста Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны — адна з найбольш перспектыўных у вайсковай сферы, — упэўнены Яўген Галузаў. — Цікавая праца, створаны ўсе ўмовы, магчымасці кар'ернага росту. Аднак, калі не любіш справу, якой займаешся, усё — пустое. Толькі гэта не пра мяне. Яшчэ калі вучыўся ў Ваеннай акадэміі, быўшы на розных вучэннях, адчуў, што я ў «сваёй талерцы». Сёння пераконваюся ў гэтым кожны дзень, калі прыступаю да баявога дзяжурства. Адчуваю ў гэты час, што і я ў тым ліку ў адказе за паветраную бяспеку краіны.

...А мы тым часам пакідаем 15-ю зенітную ракетную брыгаду. На душы — задавальненне ад недарэмна праведзенага дня і спакой за мірнае неба над нашай Беларуссю.

**Вераніка КАНЮТА. Фота Надзеі БУЖАН.**

*Мінскі раён*



Аператыўны дзяжурны Андрэй МІХНЁНАК дакладвае абстаноўку на камандны пункт Паўночна-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання.

■ Творчы падыход

# НА ВАСТРЫІ ВАЙСКОВАГА ЖЫЦЦЯ...

### Студыя ваенных пісьменнікаў за дзесяцігоддзі існавання можа пахваліцца цікавымі праектамі і творамі



Намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Алесь БАДАК падарыў студыі ваенных пісьменнікаў кнігу Мікалая Смірнова «Генерал Корж».

**На днях студыя ваенных пісьменнікаў адзначыла 10-годдзе з дня ўтварэння. Для гісторыі прамежак, вядома, невялікі, але і за гэты час зроблена нямала. Выдадзена 2 літаратурныя зборнікі, напісаны дзясяткі твораў, адбылося больш як 150 творчых сустрэч літаратараў з вайскоўцамі.**

— Сімвалічна, што гэты юбілей мы адзначаем у гадавіну вельмі яркіх памятных дат, — зазначыў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА.** — 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 75-годдзе далучэння Заходняй Беларусі да БССР, што азначала аб'яднанне беларускага народа ў адзіную дзяржаву. Безумоўна, адной з найважнейшых гістарычных дат, якая назаўсёды ўвайшла ў гісторыю, з'яўляецца 20-годдзе выбару беларускім народам першага Прэзідэнта. Сімвалічна і тое, што студыя ваенных пісьменнікаў была створана літаральна праз месяц пасля таго, як утварыліся органы ідэалагічнай работы Узброеных Сіл. А сёння ў сферы ідэалогіі разгортваецца галоўная бітва за свядомасць людзей. Таму смела можна сказаць, што ў наш час літаратура і мастацтва ў большай ступені, чым у мінулым, з'яўляюцца фактарамі забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

З 2008 года пры непасрэдным удзеле членаў студыі падрыхтавана і выйшла 9 літаратурна-мастацкіх дадаткаў да часопіса «Армія» Міністэрства абароны — «Армія і культура». У год выходзіць два нумары, дзе публікуюцца вершы, нарысы, урыўкі з новых твораў пісьменнікаў.



Немалая заслуга членаў студыі і ў пытаннях прапаганды гераіка-патрыятычнай спадчыны пісьменнікаў старэйшага пакалення, папулярызацыі твораў беларускіх пісьменнікаў, прыцягнення да творчай дзейнасці маладых аўтараў.

— У студыю ўваходзяць крыху больш за 40 пісьменнікаў, — расказаў **кіраўнік студыі ваенных пісьменнікаў Яўген КАРШУКОЎ.** — Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Алесь Савіцкі і Мікалай Іваноў, ветэраны Узброеных Сіл, людзі, якім неабыякавая ваенна-патрыятычная тэма. Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў членамі студыі рыхтуецца зборнік, куды ўвойдуць як ужо вядомыя творы, так і тыя, якія напісаны параўнальна нядаўна.

Акрамя гэтага, Яўген Каршукоў з'яўляецца кіраўніком самага старэйшага ў Беларусі літаратурнага аб'яднання «Доблесць», якое адразу пасля вайны было заснавана пісьменнікамі-франтавікамі. Некаторыя з іх і сёння складаюць асноўны актыў студыі.

— Вельмі мудры крок кіраўніцтва беларускай арміі і кіраўніцтва дзяржавы, якія стварылі гэтую студыю, тым самым даручыўшы нам прапаганду мастацкага слова, культуры і лепшых дасягненняў Беларусі сярод вайскоўцаў, — перакананы **лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь пісьменнік Алесь САВІЦКІ.** — І мы жывём у такі час, калі кожны дзень пацвярджае правільнасць гэтага кроку. І гэта важна, каб пісьменнік сёння быў на вастрыі салдацкага жыцця. Каб вайсковец адчуваў, што за яго плячыма не проста кавалак зямлі, а яго Радзіма, дом яго і братоў, былая слава бацькоў, якую трэба берагчы. Пісьменнікі Беларусі паказалі выдатныя ўзоры таго, як трэба сёння займаць гэтую пазіцыю. І жыццё пацвердзіла, што будучыню народа, будучыню краіны, будзе вырашаць не ядзерная, а інтэлектуальная энергія. Той народ, тая нацыя, якая назапасіць гэтай энергіі больш, пераможа ў будучых сутыкненнях.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ**



Генерал-маёр Аляксандр ГУРА ўручае дыплом Міністэрства абароны кіраўніку студыі ваенных пісьменнікаў Яўгену КАРШУКОВУ.

■ Нельга забыць

# ЛЯСНЫЯ ПОМНІКІ ЖЫВУЦЬ

1944-2014 70 гадоў вызвалення

## Іх дагледаюць жыхары вёсак і мясцовая ўлада

**З пачаткам вясны ўсюды пачынаецца актыўная прыборка тэрыторыі. Прыводзяцца ў парадак і тэрыторыі вакол помнікаў, якія знаходзяцца ў населеных пунктах. Але ў нас нямала памятных знакаў ахвярам вайны, устаноўленых даволі далёка ад гарадоў і вёсак. Многія знаходзяцца ў глыбіні лясоў, там, дзе праводзіліся масавыя расстрэлы або загінулі людзі. Сённяшняя размова — менавіта пра такія помнікі.**

### Крыжы, якія падаюць

У Белавежскай пушчы, у самай глыбіні векавога лесу, стаіць унікальны помнік ахвярам фашызму. Называецца ён «Крыжы, якія падаюць». Першы раз мне давялося наведаць помнік зімой. На фоне белага снегу нахіленыя крыжы глядзяцца вельмі незвычайна. З розных бакоў вялізныя бетонныя стэлы выглядаюць зусім па-рознаму. Калі глядзець прама, яны падобны да слупоў і перакладзін, ступіш крок управа або ўлева — здаецца, манумент нахілены ўперад, а глянеш на яго збоку — сапраўды, крыжы вось-вось упадуць на зямлю.

Крыху воддаль за крыжамі да гэтай пары прыкметны равок, у якім знайшлі спачын больш за сто расстраляных вяскоўцаў. Іх закатавалі ў першыя дні жніўня 1941 года. У іншых рэгіёнах фашысты пачалі лютаваць пазней, калі адчулі супраціўленне насельніцтва, прысутнасць партызанаў. А тут толькі прыйшлі — пачалі забіраць мясцовых актывістаў, а разам з імі часта і тых, хто пад руку трапіць. Людзей зганялі ў лес некалькі дзён, а з лесу яны ўжо не вярнуліся.

Аказваецца, у гэтай магіле ляжаць жыхары вёскі Белавежа, а таксама суседніх паселішчаў, якія пасля вайны сталі тэрыторыяй Польшчы, а брацкая магіла жыхароў вёскі Чадзель Пружанскага раёна цяпер знаходзіцца ў Польшчы. Такія вось зігзагі гісторыі... Раней, калі памежны рэжым быў бязвізавым, з абодвух бакоў раз на год ладзіліся памінальныя мерапрыемствы. Да родных магіл хадзіла шмат людзей з адной і другой дзяржаў. Цяпер працэдура стала больш складанай, і мерапрыемствы праходзяць больш сціпла. Але праходзяць. Вось і сёлета 2 жніўня ў Пружанскім раёне ля крыжоў збяруцца людзі.

— Да гэтай пары помнік будзе грунтоўна адрамантаваны, — паабяцаў **намеснік старшыні Пружанскага райвыканкама Мікалай КУДРАВЕЦ.** — Бо з 1980 года, калі яго ўзвялі пружанскія будаўнікі па праекце польскіх архітэктараў, манумент перажываў толькі бягучыя рамонты.

Ляснічы Нікарскага лясніцтва Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Аляксандр ПЕКАЧ расказаў, што бетон пачаў у многіх месцах разбурацца, рамонт патрабуецца тэрмінова. Парадак на прылеглай тэрыторыі падтрымліваюць леснікі. І на гэты раз напярэдадні Дня Перамогі тут усё пачысцілі, прыбралі, заўважыў Аляксандр Міхайлавіч. Не забыліся і пра суседні сціплы абеліск двум загінулым партызанам, які стаіць на тэрыторыі лясніцтва. Яго пабялілі, прывялі ў парадак наваколле.

«Крыжы» па традыцыі дагледаюць супрацоўнікі лясніцтва, бо ўезд на тэрыторыю пушчы мае асаблівы рэжым. З боку вёскі Белы Лясок прапускаецца толькі спецыяльны і службовы аўтатранспарт. А вось удзельнікі веласіпедных экскурсій цяпер могуць наведаць і гэты помнік.

### Шэсць стваловў — як шэсць душ

Помнік у Шчэбрынскім лесе незвычайны тым, што побач са сціплым абеліскам, які стаіць на месцы расстрэлу дзвюх сем'яў вырас граб з шасцю ствaламі. Выходзіць, сама прырода ўвекавечыла памяць бязвінна загубленых.

Гэта зусім недалёка ад Брэста, паміж вёскамі Радванічы і Франапаль, пры Польшчы тут знаходзілася сядзіба мясцовага ляснічага Івана Гаўрылюка. Пра тое, што былы ляснічы з першых дзён вайны дапамагаў партызанам, месцічы даведаліся толькі пасля таго, як яго, жонку і малога сына па-зверску забілі — пра гэта і расказвае шыльда з тыльнага боку помніка. А цэнтральная шыльда змяшчае звычайны абстрактны тэкст: «Бясстрашным і мужным воінам і партызанам». Тое, што лістападаўскім днём 1942 года была закатавана таксама сям'я Пятра Фёдаравіча Белавежы, мясцовым краязнаўцам стала вядома пазней. Пятра Белавежу, як і Івана Гаўрылюка, забілі з жонкай і сынам. Іх дзеці былі амаль равеснікі — хлопчыкі 10-11 гадоў.

У 1970-я гады тут паставілі сціплы абеліск. Раней сюды вяла даволі шырокая дарога, нават раённыя мерапрыемствы праводзіліся, прымеркаваныя да памятных дат. Але мяняюцца пакаленні, дарога паступова робіцца больш вузкай і непрыкметнай. А граб тым часам становіцца вышэйшым. Хутчэй за ўсё, у адно сышліся некалькі дрэў, якія потым шчыльна зрасліся камлямі. І кожны ствол, нібы нага, абапіраецца на зямлю. А далей, угары, дрэвы трохі разыходзяцца адно ад аднаго і завяршаюцца вялізнай раскошнай шапкай зялёнай лістоты, якая толькі распусцілася.

(Заканчэнне на 4-й стар.)



Абеліск ля вёскі Лескі Камянецкага раёна.